Беларуская нацыянальная платформа
Форум грамадзянскай супольнасці
УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

22.07.2016

**Зварот Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства**

## «У сувязі з забойствам Паўла Шарамета»

*Мы, прадстаўнікі арганізацый грамадзянскай супольнасці Беларусі, аб'яднаныя ў рамках Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства, глыбока смуткуем аб заўчаснай смерці беларускага і грамадскага дзеяча Паўла Шарамета, забітага 20 ліпеня 2016 г. у Кіеве, і выказваем самыя шчырыя спачуванні яго сям'і, блізкім, сябрам і калегам.*

*Мы спачуваем грамадзянскай супольнасці і незалежнай журналісцкай супольнасці Беларусі, Украіны і Расіі, атрымаўшай незаменную страту. У публікацыях, рэпартажах, дзеяннях Паўла чэсна і прафісійна адлюстроўвалася пазіцыя мільёнаў яго аднадумцаў адносна актуальных грамадска-палітычных праблем.*

У гэтыя дні з Паўлам Шараметам развітваюцца ў Кіеве і Мінску. Родныя, сябры, калегі, партнёры з любоўю і болем ўзгадваюць яго як абаяльнага чалавека, неардынарную асобу, адважнага і таленавітага журналіста, бескампраміснага грамадзяніна, які прысвяціў сваё жыццё барацьбе за пазітыўныя дэмакратычныя змены у трох постсавецкіх дзяржавах. Такім быў яго асэнсаваны выбар, нягледзячы на палітычны перасьлед і ганенні ў роднай краіне, складанасці і прыгнёт ў прафесійнай кар'еры, прамую пагрозу чалавечаму жыццю. На жаль, яго трагічная смерць у выніку злачыннага і баязлівага замаху кажа пра тое, што ўсім нам належыць прайсці доўгі шлях, каб змены, за якія Павал аддаў жыццё, сталі рэальнымі і незваротнымі.

Такое дэманстратыўнае забойства журналіста ў мірным ранішнім цэнтры Кіева з'яўляецца відавочным сведчаннем важнасці свабоды словы, значнасці ўсёй працы, праведзенай за многія гады Паўлам Шараметам на карысць грамадства, якое шукае апору ў каштоўнасцях гуманізму, дэмакратыі, сумленнасці, празрыстасці, талерантнасці, супрацоўніцтва.

Мы патрабуем ад кампетэнтных асобаў і структур Украіны хуткага, поўнага і аб'ектыўнага расследавання абставінаў забойства Паўла Шарамета, вызначэння і законнага асуджэння вінаватых у яго гібелі.

Мы заклікаем журналісцкую і грамадзянскую супольнасьць Беларусі, Расіі, Украіны працягнуць справу Паўла Шарамета і гэтым ушанаваць памяць выбітнага чалавека, грамадзяніна, прафесіянала!

*Беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці, удзельнікі Беларускай нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Ўсходняга партнёрства*